EU4IM
ГРАНТ НА СТВАРЭННЕ КАНТЕНТУ
Крытэры адбору

Ключавы крытэр адбору

EU4IM працуе выключна з незалежнымі медыя. Медыя павінны адпавядаць наступнаму істотнаму патрабаванню:

- Уласнік медыя і/ці ягоныя бізнэс-партнеры не умешваюцца ў рэдакцыйны працэс.

Грантаатрымальнікі, якія адпавядаюць крытэрам адбору:

- Усе зарэгістраваныя навінавыя арганізацыі, якія працуюць для аўдыторыі ў Беларусі;
- Журналісцкія некамерцыйныя арганізацыі;
- Незалежныя прадусарскія кампаніі;
- Журналісты/здымачныя групы, якія дзейнічаюць ад імя кагосьці, хто пералічаны вышэй.

Грантаатрымальнікі, якія адпавядаюць крытэрам адбору, павінны:

- Функцыянаваць не менш за 6 месяцаў да моманту падачы заяўкі;
- Ствараць кантэнт на больш чым адной пляцоўцы (сацыяльныя сеткі лічацца таксама пляцоўкамі);
- Мець уласны кодэкс журналісцкай этыкі/рэдакцыйную палітыку/сяброўства ў журналісцкай арганізацыі з сумесным кодэксам журналісцкай этыкі альбо рэпутацыю прытрымлівання журналісцкіх стандартаў ці ўдзел у адпаведных ініцыятывах;
- Не дапускаць падвоенага атрымання падтрымкі на заяўленую публікацыю ад іншых праектаў, якія фінансуюцца ЕС.

Наступныя медыя не адпавядаюць крытэрам адбору для атрымання гранту:

- Міжнародныя тэле-радыё кампаніі;
- Міжурадавыя арганізацыі;
- Арганізацыі, якія знаходзяцца на стадыі ліквідацыі, банкруцтва альбо супраць якіх былі вынесеныя судовыя рашэнні за карупцыю/махлярства; у выпадку атрымання, арганізацыі мусяць прадастваіць дадатковыя дакументы і/ці заяву аб адпавяданні крытэрам адбору.

- Арганізацыі/журналісты, якія запрашваюць падтрымку з відавочнай мэтай тролінгу ці махлярства.

Усе канчатковыя рашэнні адносна крытэраў адбору будуць прымацца камандай экспертаў EU4 Independent Media.